View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository



Проведенный нами анализ новостных текстов позволил установить, что они имеют свою специфику, обусловленную средой Интернета, ее уникальными возможностями. По нашему мнению, сайты интернет-СМИ могут значительно увеличить свою читательскую аудиторию за счет пользователей поисковых систем и социальных медиа благодаря специально подготовленным текстам для них, расширить творческий диапазон, выходя за границы классической журналистики.

### Литература

1. Интернет-СМИ: теория и практика: учеб. пособие для студ. вузов / М.М. Лукина [и др.]; под ред. М.М. Лукиной. – М.: Аспект Пресс, 2010. – 348 с.
2. *Сметанина, С.И.* Медиа-текст в системе культуры: динамические процессы в языке и стиле журналистики конца XX века / С.И. Сметанина. – СПб.: Изд-во Михайлова В.А., 2002. – 382 с.
3. *Іўчанкаў, В.І.* Медыярыторыка: рытарычныя асновы журналістыкі, лінгвістыка публіцыстычнага тэксту, дыскурсны аналіз сродкаў масавай інфармацыі: курс лекцый / В.І. Іўчанкаў. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2009. – 280 с.
4. *Лысакова И.П.* Язык газеты и типология прессы: социолингвистическое исследование / И.П. Лысакова. – СПб.: Філол. фак. СПбГУ, 2005. – 256 с.
5. *Касютин В.Л.* Живая газета / В.Л. Касютин. – М.: Издательский дом «Хроникёр», 2008. – 246 с.
6. *Price, J.* Hot Text: Web Writing that Works / J. Price, L. Price. – New Riders Press, 1 edition, 2002. – 528 p.
7. *Амзин, А.А.* Новостная интернет-журналистика: учеб. пособие для вузов / А.А. Амзин. – М.: Аспект Пресс, 2011. – 142 с.
8. *Лукина, М.М.* Трансформации журналистского текста в условиях интернет-среды / М.М. Лукина // Вестн. Моск. ун-та. – 2009. – № 3. – С. 54–73.
9. This Boring Headline Is Written for Google [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.nytimes.com/2006/04/09/-weekinreview/09lohr.html? – Дата доступа: 15.03.2012.
10. Рейтинг@Mail.ru – Дубровно. Дняпроўская праўда: источники посетителей [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://top.mail.ru/sources?id=1878760&period=2&date=-2012-02-15. – Дата доступа: 15.03.2012.
11. Статистика ключевых слов на Яндексе: Браслав [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://wordstat.-yandex.ru/?cmd=words&page=1&text=Браслав. – Дата доступа: 15.03.2012.
12. *Мечковская, Н.Б.* Постсоветские языки в условиях государственного суверенитета и расцвета информационных технологий / Н.Б. Мечковская // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сер. 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2011. – № 2. – С. 75.

### Summary

*The article is devoted to the changes happening in the journalistic text in the Internet environment. The article tells about the main tendencies of Internet-journalism development. The main characteristics of new mass media are revealed. The analysis of influence of digital technologies on journalists' creativity with some objective laws governing the function of Internet mass media is given. Standards of creation of news texts are established. Information graphics as an instrument of attraction of modern audience is examined. The following models are characterised as the most successful examples of new media: social networks, blogs and news portals. We formulate possible ways of optimisation of activity and give the recommendation about improvement of quality of creation news texts. The article shows how the Internet has influenced the news agenda, brought genre and structure changes to the journalistic pieces.*

Поступила в редакцию 19.03.2012 г.

Рэпазіторый БДПУ

*УДК 821.161.3:398*

***І.А. Швед,***
*доктар філалагічных навук, прафесар кафедры беларускага літаратуразнаўства БрДУ імя А.С. Пушкіна*

# МОРА ЯК ЭЛЕМЕНТ КАСМАЛАГІЧНАГА КОДА БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ

Перажыванне свету, як такога, што знаходзіцца ў пераходным стане, звычайна выклікае ўзмацненне трывожнасці ў грамадстве і актывізуе эсхаталагічную міфалогію і адпаведныя архаічныя комплексы, архетыпы. Гэта матывуе рост цікавасці навукоўцаў і шырокай грамадскасці да касмаганічных і касмалагічных канструкцый пэўных этнічных культур, міфапаэтычных уяўленняў аб прыродна-касмічных аб'ектах.

Цікавасць да міфалагічнага асэнсавання прыродна-касмічных аб'ектаў, іх сімволікі ў фальклорных творах устойліва захоўваецца з самых першых крокаў развіцця славянскай фалькларыстыкі (згадаем слоўнікі па славянскай міфалогіі М. Чулкова, М. Папова, С. Глінкі, А. Кайсарава) і працягваецца ў другой палове XIX ст. Яна выяўляецца як у сферы збіральніцкай дзейнасці і публікацыі экспедыцыйных матэрыялаў, так і ў першых спробах асэнсавання гэтых матэрыялаў у работах па міфалогіі і славянскіх старажытнасцях (Ф. Буслаеў, А. Патабня, У. Даль і інш.). Вялікі матэрыял па «паэтычных поглядах славян на пры-

роду» быў абагульнены ў аднайменнай трохтомнай кнізе А. Афанасьева, якая пабачыла свет у 1865–1869 гг. і была напісана ў рэчышчы міфалагічнай школы. На працягу XIX–XX стст. у славянскай фалькларыстыцы і этнаграфіі была назбірана вялікая колькасць факталагічных сведчанняў, якія адлюстравалі агульнаэтнічныя і вузкалакальныя дадзеныя пра семіятызацыю прыродна-касмічных аб’ектаў, іх сімволіку ў пэўных відах і жанрах фальклору славянскіх народаў. Навукова-тэарэтычная распрацоўка гэтай шматграннай тэмы не паспявала за нагрувашчваннем усё новых матэрыялаў. Даследаванні ў гэтай галіне рушылі наперад пасля з’яўлення прац вядомага этнографа Д. Зяленіна, прысвечаных духоўнай сферы народнага жыцця, рэканструкцыі міфалагічных уяўленняў пра пэўныя чыннікі светабудовы.

Адным са значных фрагментаў міфапаэтычнай мадэлі свету, частотным фальклорна-міфалагічным вобразам беларускага фальклору з’яўляецца мора. Т. Валодзіна звярнула ўвагу на тое, што менавіта вобраз мора, а не іншых гідрааб’ектаў, фігурыруе ў беларускай парэміялогіі [1, с. 41]. Вобраз мора, прадстаўлены ў жанрах беларускага фальклору, трапляў у поле зацікаўленняў іншых даследчыкаў, якія выказвалі розныя меркаванні наконт генезісу і семантыкі названага феномена. На міфалагічную трактоўку мора як першастыхіі ўказала Т. Шамякіна. «У “Галубінай кнізе” і духоўных вершах “кіян-мора” называецца “ўсім марам маці”. Магчыма, таму, што яно акаляе ўсю зямлю. У той жа час востраў Буян, які знаходзіцца пасярод мора, з’яўляецца “пупом свету”, цэнтрам Зямлі» [2, с. 72–73]. Даследчыцы належыць таксама гіпотэза пра тое, што казкі, у якіх часта згадваюцца мора і рака Дунай, «маюць на ўвазе і нябеснае мора, і нябесную раку Дунай…» [2, с. 85]. На прасторавую сувязь мора і раю ў беларускім фальклоры звярнуў увагу А. Ненадавец [3, с. 122]. Паводле слушнага меркавання Г. Барташэвіч, у замовах мора фігурыруе як элемент разгорнутай формулы, які абазначае адкрытую прастору, дзе знаходзяцца рознага кшталту змеі [4, с. 107]. На лакатыўную сувязь змяі з морам у казках, у прыватнасці аб царэўне, указаў К. Кабашнікаў [5, с. 195]. Разглядаючы архаічную песню абрадавай функцыянальнасці «Дунай з морам паспіраліся», А. Ліс адзначыў, што мора ўваходзіць у групу варожых да чалавека прыродных стыхій і аб’ектаў [6, с. 288]. Беларускі фальклорны матэрыял, у якім актуалізаваны вобраз мора, у сувязі з прадметам свайго даследавання, выкарыстоўваецца замежнымі навукоўцамі. У прыватнасці, у артыкуле «Мора» В. Бяловай і Л. Вінаградавай, якія змешчаны ў этналінгвістычным слоўніку «Славянские древности» (М., 2004, т. 3.), слушна сцвярджаецца, што ў міфа-фальклорным вобразе мора актуалізуецца прыкмета бязмежнасці, велізарных памераў і прыводзіцца беларускае народнае ўяўленне: пра тое, дзе пачынаецца і дзе заканчваецца мора, ведаюць толькі птушкі, якія на зіму адлятаюць у міфічную краіну вырай, якая размешчана сярод цёплага мора. Мора – чыннік міфапаэтычнай традыцыі славян – слушна трактуецца маскоўскімі даследчыкамі як адна з першаасноў светабудовы, сімвал нязведанай прасторы, незвычайнага, цудоўнага свету, локус прабывання духа-«гаспадара мора», персанажаў нячыстай сілы, хтанічных жывёл. Шэраг аспектаў міфалогіі мора на беларускім матэрыяле раскрыты ў сціслым артыкуле І. Швед у слоўніку «Міфалогія беларусаў» (Мінск, 2011), а таксама ў працах некаторых іншых вучоных. Нягледзячы на тое што вобраз мора з’яўляецца адным з вызначальных чыннікаў міфапаэтычнай мадэлі свету беларусаў, адсутнічае яго спецыяльнае даследаванне як элемента касмалагічнага кода.

Код у самым агульным выглядзе трактуецца як сістэма абазначэнняў для перадачы, апрацоўкі і захавання інфармацыі ў форме канцэптуальных утварэнняў, як корпус знакаў, акрэслены слоўнік і сістэма адносін (сінтаксіс) ці выкарыстоўваецца як паняцце, блізкае паняццю «ідэалогія», бо любое выказванне не проста арганізавана паводле пэўных правілаў (камбінаторыкі, адпаведнасці), але і з пэўнага пункту гледжання. Касмалагічны код – так намі ўмоўна азначаецца сродак традыцыйнага мадэліравання свету на аснове яго пазнання, ацэнкі і апісання праз сімвалы неба, паветра, зямлі, мора (мора-акіяна), выраю, пекла, гары і пад., якія ўтвараюць акрэсленую сістэму адносін.

Мэта дадзенай працы – вызначыць семантыку, сімволіку і функцыянаванне вобраза мора як чынніка касмалагічнага кода беларускага фальклору. Для дасягнення пастаўленай мэты гісторыка-генетычнае вывучэнне, якое арыентуецца на дыяхранічны і парадыгматычны разгляд фальклорнага вобраза мора як цэласнага феномена, дапаўняецца функцыянальна-семантычным даследаваннем.

***

Мора ўключаецца ў шэраг прыродных аб’ектаў, якія маюць высокі семіятычны статус у традыцыйнай мадэлі свету і займаюць вызначальныя пазіцыі ў міфапаэтычнай касмалогіі і касмагоніі. Паводле касмаганічных легендаў, мора было яшчэ перад пачаткам свету

Рэпазіторый БДПУ

і выступала ў якасці **праматэрыі жыцця**; з марскога дна дэміург дастаў зямлю для тварэння сушы. Між тым, паводле калядак з касмаганічнымі матывамі, мора з'явілася ў выніку таго, што са свечак з дубоў-першадрэў паляцелі іскры [7, с. 222]. У казках мора як перашкода для праследавацеляў можа ўзнікаць з магічных прадметаў, напрыклад, з патэльні, кінутай героем, які ўцякае ад дэманічнай істоты. Мора з'яўляецца і ў выніку махання цудоўнай хусцінкай [8, с. 159].

Паводле касмалагічных уяўленняў, мора – **першасная прыродная стыхія, бязмежная прастора**. За морам, дзе зямля сутыкаецца з небам, знаходзіцца край зямлі [9, с. 48]. Усе рэкі і крыніцы сваім пачаткам і канцом маюць сусветнае мора. Паводле замовы ад урокаў, царыца-вадзіца, марская крыніца, коціцца *па тонкім жылам, марскім сілам* [10, с. 257]. Лічылі, што пасярод цёплага мора ці за морам знаходзіцца міфічны вырай, куды на зіму паўзуць змеі на чале са сваім царом і адлятаюць птушкі. У замовах сусветнае мора акаляе сакральны цэнтр, дзе чалавек пазбаўляецца ад хвароб і іншых немачаў [11, с. 232].

У фальклоры мора і зямля выступаюць як два ўзаемадапаўняльныя **складнікі касмічнай прасторы** з адпаведнай семантыкай [12, с. 211; 13, с. 228]. Яны разам з небам утвараюць тры найважнейшыя вертыкальныя ярусы светабудовы, дзе **мора асацыіруецца з касмічным нізам**. На дне мора можа лакалізавацца *прыісподняя* [8, с. 353]. Кожны з ярусаў адзначаны пэўнай зааморфнай серыяй ці *царом*: *«Месячак на небе, // Зайка ў полі, // Рыбачка на морэ. // Калі яны сайдуцца ўсе разам, // Тады ў рабы Божай (імя) // Зубачкі забалеюць. // Амінь. Амінь. Амінь* (чытаці на сходзячы месячак 9 разоў)» [Слаўнае Кобрынскага р-на][1]. Трансфармацыю замоўных матываў знаходзім у песнях тыпу *«– Ой, усхваляўся свецел месячык: // – Ой, як я ўзыду ўночы-паўночы, // То зарадуеца шчука у моры, // Шчука у моры, а звер у полі»* [7, с. 115]. Паказальна, што мора, як і зямля, неба, можа раскрывацца і замыкацца [10, с. 210], а таксама *граць*, як сонца [14, кн. 5, с. 229].

Мора разам з гарой, лесам і полем, **вызначае межы прасторы, якая адносіцца да іншасвету** і населена міфічнымі істотамі. Устойлівыя выразы тыпу «за сінімі марамі, за крутымі гарамі», «на трыдзясятай зямліцы, за сінімі марамі, за шчырымі барамі», «за сінім морам, за роўным полем» захоўваюць матыў рубежнасці мора, знаходжання мора на мяжы светаў і выкарыстоўваюцца для абазначэння крайняй ступені аддаленасці ад чалавечага свету [12, с. 104]. Казачныя героі за морам – **аддаленым, цудоўным светам** – здабываюць чарадзейныя прадметы. У парэміях за морам (= вельмі далёка) знаходзяцца думкі [15, с. 61], неверагодна танны вол [15, с. 132] і інш. Паводле вясельных песень, з-за мора (ці па моры) трапляюць на вясельную ўрачыстасць не толькі падарункі, але і сам каравай: *«Да по моры, да по тыхому Дунаю // Прыплывай да вбырайся, куруваю, // В рожовую квітку, да в мяту, // Да шоб молодыі діты любылы…»* (Адрыжын Іванаўскага р-на). Ідэі аддаленасці і небяспекі перадаюцца праз актуалізацыю вобраза мора і ў парэміях накшталт *«Без Бога ні да парога, а з Богам хоць за мора»* [15, с. 274]. У старажытных і параўнальна новых песнях даставанне чагосьці з мора (ці здабыванне з-за мора) выяўляецца як цяжкая задача-іспыт для жаніха, да прыкладу: *«Ой на горэ больніца стояла, // У той больніцы Маруся лежала, // Чорным платком голову звезала. // Хто ў моры зелейка достане, // Той Марусі под ручэньку стане. // Прыехало тры козакі з полку, // Розвязалі Марусі головку. // Одзін кажэ: "Я Марусю люблю!" // Другі кажэ: "Я Марусю возьму!" // Трэйці кажэ: "Я ў моры зелейка достану, // Дэй з Марусей под ручэньку стану"»* (Харомск Столінскага р-на). Прыкмета **надзвычай велізарных памераў** мора выявілася ў парэміях *«Вялік як мора»*, *«Каму смех, каму гора, каму лужа, каму мора»*, *«П'яны і мора выпіваець»*, *«П'янаму мора па калена»*, *«Не шукай мора – у лужы ўтопішся»*, *«Лыжкаю мора не вычарпаеш»* [16, с. 31, 33, 74, 100, 105, 173]. Такія характэрныя рысы мора, як **глыбіня і ўзаемасувязь з зямлёй** (дном, берагам), актуалізуюцца ў песеннай вобразнасці, у паэтычных канструкцыях паралелізму, да прыкладу: *«Нэ відало море дна // Я й од мамонькі далёко // Нэ відала года два»* (Вайцяшын Бярозаўскага р-на). У замовах, абрадавых песнях сінанімічным мору вобразам выступае поле. Вар'іраванне вобразаў поля (нівы) і мора характэрнае для тэкстаў тыпу *«– Дзе ж мае каравайніцы, // Дзе ж мае раснарадніцы? // Ці на моры загуляліся, // Ці на ніві да запіліся?»* [17, с. 258]. Указаная карэляцыя ў такіх тэкстах адбылася на аснове ўяў-

[1] У працы выкарыстаны матэрыялы архіва вучэбнай фальклорна-краязнаўчай лабараторыі БрДУ імя А.С. Пушкіна, якія сабраны ў выніку палявых даследаванняў, праведзеных аўтарам гэтай працы, студэнтамі і выкладчыкамі БрДУ на працягу 1993–2011 гг. Гэтыя матэрыялы прыводзяцца далей без указання на тое, што яны захоўваюцца ў названым архіве.

Рэпазіторый БДПУ

ленняў пра мора і поле як пра шырокія, вольныя прасторы, надзеленыя семантыкай пераходнасці і тагасветнасці, што даволі паказальна і цікава. Нездарма ў замовах *за* (ці *ў*) гэтыя локусы выправаджваюцца хваробы, урокі.

**Сімвалічныя комплексы і апазіцыі** вобраз мора разам з прыродна-ландшафтнымі вобразамі ўтварае і ў шэрагу іншых кантэкстаў. Так, у песенных тэкстах аднолькавай функцыянальнасцю могуць вызначацца аднесеныя міфапаэтычнай свядомасцю да «чужога» свету сіняе мора і цёмны лес [17, с. 104]. У вусна-паэтычных творах эквівалентнымі мору вобразамі могуць быць рэкі Дунай, Вісла, напрыклад: *«Там, за морам, за ракой // Жылабыла ўдава»* [18, с. 128]; *«Ой там каля рэчкі, // Ой там каля мора // Клікаў казак дзеўку да сябе ў камору…»* (Бакуны-2 Пружанскага р-на). Мора можа не адрозніваца ад акіяна і возера [14, кн. 1, с. 283] і проціпастаўляцца лугам, рэкам [7, с. 415], бору [8, кн. 5, с. 200]. Прычым ацэнка мора ў такіх кантэкстах з'яўляецца неадназначнай і нават палярнай. У народнай фразеалогіі мора можа проціпастаўляцца зямлі адпаведна прыкметам зыбкі / цвёрды, мокры / сухі, небяспека / бяспека, а таксама небу паводле прыкмет глыбокі / высокі, ніз / верх. У казках мора, рака, возера, лес, гара функцыянуюць у адным семантычным полі – выступаюць перашкодамі, якія павінны пераадолець героі (як станоўчыя, так і адмоўныя), каб трапіць з аднаго свету ў іншы.

У казкавай прозе, абрадавых і пазаабрадавых песнях мора – **небяспечная, цяжкадасягальная**, «**чужая**» **прастора** – месца пакарання, прынясення ахвяр, самагубства, сімвалічнага паўторнага нараджэння, ініцыяцыі, бойкі. У песнях з матывам шлюб-смерць *крамушкі – то падушкі, лілея – нявеста* для молайца, які тоне ў моры [19, с. 389]. Мяркуецца, што людзі, кінутыя ў кошыках, бочках у мора [8, с. 184], павінны быць выключаны з калектыву, памерці, але яны часта пачынаюць новае, лепшае за ранейшае жыццё, трапляючы на сушу [20, с. 616]. Да мора адсылаюць дзяўчат, царскіх дочак на з'ядзенне змею (шматгаловаму *Смоку*, *кракадзілу* [20, с. 102]). У казцы «Гвідон Саміхлёнавіч» апавядаецца, як няверны цар кліча героя ваяваць на моры [8, с. 285]. Мора як аддаленая ад людзей прастора, **сімвал мяжы паміж двума светамі** выяўляецца ў песнях са шлюбнай тэматыкай. Пераправа праз мора, надзеленае **медыятыўным значэннем**, абазначае пераход з аднаго стану ў іншы, змену статусу. Пераправіцца праз мора малайцу дапамагае чароўны памочнік, у прыватнасці, змяя [7, с. 227]. У шэрагу кантэкстаў жаніх сам «селязнём мора сплывае». У каляндарна-абрадавых песнях праз мора ў чалавечы свет пераходзяць сакральныя госці.

З морам, надзеленым значэннем медыяцыі, сваёй **лакатыўнасцю** звязаны людзі ў лімінальным стане, заклятыя, уцекачы ад праследавання, тыя, хто заблудзілі. Паводле песень, на моры (яго ўзбярэжжы) лакалізуюцца маргіналы, да мора прыходзяць выказаць сваё гора пакрыўджаныя (*«Іду я к мору з вялікага гора…»* [10, с. 153]). На *краю мора* жыве ўдава: *«Жыла ўдова на край мора // Мала сабе дзевяць сыноў, // А дзесяту дочку-швачечку…»* (Любань Лунінецкага р-на). У моры лакалізуюцца казачныя і міфалагічныя антрапаморфныя персанажы. Паводле казак, з мора выходзяць незвычайныя прыгажуні накшталт Яваркі [8, с. 365], Дзеўкі-Паланянкі, іх прыслуга, каровы, коні [8, с. 366]. Апавядалі, што *«хонди – самы те русаўки. Выдуть из мора – сильно красивые…»* [21, с. 244]. З сімволікай мора – далёкага, невядомага, цудоўнага свету – звязана яго функцыянальнасць як лакалізатара магічных жывёл, сакральна вызначаных раслін, прадметаў [20, с. 96]. З морам (як і з зямлёй ды агнём) у казках звязаны пакаранне адмоўных герояў і ўзнагарода станоўчых. На моры ці яго ўзбярэжжы, паводле адносна позняга песеннага фальклору, лакалізуюцца такія жывёлы, як рак (*«Ой чого ж ты задаешся, // Як у моры красны рак, // Разві я цэбэ не знаю, // Болоховны ты дурак»* (Рубель Столінскага р-на), валы (*«Да чые ж гэто сівы волы // Край мора ходзілі? // Гэто ж того гарна хлопца, // Шо мы ўтрох любілі»* (Любань Лунінецкага р-на) і інш. У вераваннях, загадках, дзе выяўлены класіфікацыі элементаў свету і іх узаемасувязі, з морам карэлююць снег [22, с. 51]), вясёлка (*«Вутка ў моры – хвост у горы»* [22, с. 44]) і інш. У такіх кантэкстах ускосна прадстаўлены архаічныя ўяўленні пра сувязь мора з небам.

Мора мае высокі каштоўнасны статус і пазітыўную ацэнку, калі выступае **крыніцай дабрабыту**. Менавіта адтуль, паводле песень са шлюбнымі матывамі, з'яўляецца дзіва – незвычайна багатыя госці [7, с. 124–125; 13, с. 255]. У замове *ад уроку* гаворыцца, што ў *чыстае поле, на сіняе мора* адпраўляецца кароўка, каб *«прынесла малака поўныя бака»* [10, с. 58]. Адзначым, што мора з яго бясконцымі глыбінямі выступае надзейным сховішчам ключоў у шматлікіх замовах і песнях [23, с. 614; 19, с. 451 і інш.].

Мора нярэдка выяўляецца як **жывая істота**. Так, у казках, калі герой знаходзіцца ў роспачы, перажывае лёсавызначальныя падзеі, мора бушуе, раве. Хвалюецца мора і тады, калі з яго выходзіць змей [8, с. 156]. У абрадавых

Рэпазіторый БДПУ

песнях мора звычайна адухаўляецца ў яго аб'ектыўна-прыроднай іпастасі. У канструкцыях вобразнага паралелізму з морам можа асацыіравацца хлопец, жаніх; пры гэтым эмацыянальны стан, паводзіны чалавека сімвалізуюцца праз дзеянні, функцыі прыроднага аб'екта, як у вясельнай песні: *«Хвалілась мора, хвалілась шырока, // Што ў яго вады многа… // Хваліўся Коля, хваліўся млоды, // Што ў яго радні многа…»* [17, с. 125].

Мора можа выступаць як **смертаносная, агрэсіўная стыхія**, як краіна смерці і персаніфікацыя зла і па гэтых характарыстыках проціпастаўляцца «лагодным» рэкам [7, с. 463]. **Паглынальныя ўласцівасці** мора, яго сувязь са смерцю актуалізуюцца ў парэміях тыпу *«Рот – мора, усё з'есць», «Што было, даўно на мора сплыло»*, *«Ключыкі ў мора аддаць»* у значэнні 'памерці'. Балады нярэдка распрацоўваюць матыў патаплення няшчаснага чалавека ў моры [13, с. 233]. Смерць хлопца можа маляваца як шлюб, тады мора – сімвал вясельнага дому і шлюбнага ложка. Згадаем фармалізаваны вобраз мора ў прыпеўцы: *«Ой, я жала – выжінала // На горы овсяніцу. // Лучше в море утопіться, // Чым пойти за п'яніцу»* (Малеч Бярозаўскага р-на). У моры як першаснай і вечнай стыхіі, паводле казак, лакалізуецца смерць *Бяссмертнага Кашчэя* [23, с. 483].

Мора **ізалюе, аддзяляе ад зямлі, чалавечага свету** ўсё, што размяшчаецца ў ім (вырай, закляты замак, незвычайны востраў [8, с. 32]). Яно **падзяляе свет чалавечы і нечалавечы**; прычым гэтая мяжа можа выяўляцца як непераадольная нават для істот, надзеленых звышнатуральнымі якасцямі. Так, у замове гаворыцца, што праз мора не можа пераплысці ведзьма [11, с. 232]. З чалавечага свету за мора высылаюцца розныя хваробы. Паводле замовы *«ад жывата», Божья мать адкідае «все болезни от рабы божьей (имя) на сухие леса, за осиновые колоды, за синие моря…»* (Вялікая Турна Камянецкага р-на). За мора адпраўлялася і персаніфікаванае гора. Так, стук вераб'я ў акно лічыўся дрэннай прыкметай. Калі гэтая птушка стукала ў акно, раілася сказаць наступнае: *«Горэ, нашэ горэ! Іды за сынэ морэ! Гарабей-пташка, як бы тобі ны було тяжко, нэсы нашэ горэ за сынэ морэ, за білы хвалі, далэкыі далі»* (Боркі Бярозаўскага р-на).

У замовах мора (мора-акіян, мора-лукамор'е, кітай-мора, мора-малакамора, мора-амара, паўмор'е і інш.) можа выяўляцца як **міфічная прастора**, у якой лакалізуецца магутны прадстаўнік іншасвету, як **безжыццёвае, пустэльнае месца, вобласць смерці**, куды адсылаюцца дэманічныя істоты: духі хвароб, нячыстая сіла, гады. У апошнім выпадку мора ўтварае сімвалічны комплекс разам з балотам, гнілымі калодамі, мхамі, рэкамі, лютымі водамі, крутымі берагамі, жоўтымі пяскамі, зялёнымі лугамі. Мора можа малявацца і як прастора, у якой размешчаны разнастайныя выгоды для хваробаносных дэманаў [10, с. 166].

Нярэдка **гаючым, ачышчальным, прадуцыравальным сродкам** выступае сама марская вада [10, с. 57]. Паводле замоўнай логікі, як марская вада з сіняга, зялёнага, жоўтага і чорнага мораў «сільна і няўрэдна», так і скаціна павінна быць *«сільна і неўрадзіма ад зла і ад злаключэнія людзей»*. У чарадзейнай казцы «Пра бязручку» гераіня па парадзе дзядулі апускае куксы ў мора, і з іх вырастаюць рукі [8, с. 272]. Прыпісванне марской вадзе такой рысы, як здароўе, характэрнае пажаданням накшталт *«Будзь здаровая, як у моры вада»* [13, с. 228].

***У заключэнне*** адзначым, што ўсталёўваючы парадыгматычныя адносіны з іншымі сімваламі, вобраз мора падпарадкоўваецца канкрэтным сінтагматычным адносінам. У залежнасці ад кантэксту, мора, якое надзелена творчымі патэнцыямі, гаючымі ўласцівасцямі, але ў якасці асяродка жыцця пагібельнае для чалавека, здольнае выяўляць амбівалентныя значэнні. Мора – пачатак і канец існага, з аднаго боку, – універсальны вобраз першапачатковага стану свету, першасная і вечная стыхія, зыходная форма касмагенезу і жыццёвая субстанцыя, а з іншага – мора судачыняецца са сферай смерці, сімвалізуе небяспеку, надзелена медыятыўным значэннем. Мора ў міфапаэтычнай карціне свету беларусаў – сімвал бязмежнасці, невядомасці, цудоўнасці, далёкага, чужога свету, а таксама мяжа паміж чалавечым і *тым* светам, локус прабывання персанажаў нячыстай сілы, жывёл, людзей-маргіналаў, лімiналаў ды цудоўных рэалій, сакральных памочнікаў. Мора як чыннік касмалагічнага кода ўзаемадзейнічае з элементамі прыродна-ландшафтнага, жывёльнага, расліннага, персанажнага, прадметнага, колеравага, акцыянальнага і некаторых іншых кодаў. Аналіз сімволікі і функцыянавання вобраза мора ў беларускім фальклоры дае новыя магчымасці ў раскрыцці адметнасцей мадэлявання міфапаэтычнай карціны свету сродкамі касмалагічнага кода.

*ЛІТАРАТУРА*


1. *Валодзіна, Т.В.* Прастора і час сродкамі парэміялогіі / Т.В. Валодзіна // Беларускі фальклор. Жанры, віды, паэтыка: у 6 кн. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Кн. 6: Малыя жанры. Дзіцячы фальклор. – С. 32–67.


Рэпазіторый БДПУ

2. *Шамякіна, Т.* Міфалогія і беларуская літаратура / Т. Шамякіна. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2008. – 391 с.
3. *Ненадавец, А.* Міфалагічныя ўяўленні славян аб воднай стыхіі / А. Ненадавец // Беларускі фальклор. Жанры, віды, паэтыка: у 6 кн. – Мінск: Беларус. навука, 2003. – Кн. 5: Міфалогія. Духоўныя вершы. – С. 120–182.
4. *Барташэвіч, Г.А.* Магічнае слова. Вопыт даследавання светапогляднай і мастацкай асновы замоў / Г.А. Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 128 с.
5. *Кабашнікаў, К.П.* Чарадзейныя казкі / К.П. Кабашнікаў // Беларускі фальклор: жанры, віды, паэтыка: у 6 кн. – Мінск: Беларуская навука, 2002. – Кн. 4: Народная проза. – С. 166–283.
6. *Ліс, А.С.* Веснавая талака: спецыфіка абраднасці, семантыка і паэтычная прырода песеннага суправаджэння / А.С. Ліс // Беларускі фальклор: жанры, віды, паэтыка: у 6 кн. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – Кн. 1: Каляндарна-абрадавая паэзія. – С. 275–293.
7. Паэзія беларускага земляробчага календара / уклад. А.С. Ліса, падр. народ. календара У.А. Васілевіча. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 612 с.
8. Чарадзейныя казкі: у 2 ч. / склад. К.П. Кабашнікаў, Г.А. Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1973–1978. – Ч. 2. – 1978. – 696 с.
9. *Сержпутоўскі, А.К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.
10. Замовы / уклад. Г.А. Барташэвіч. – Мінск: Беларус. навука, 2000. – 597 с.
11. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / уклад. В.Д. Ліцвінка, Г.Р. Кутырова. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – 477 с.
12. *Мажэйка, З.Я.* Песні Беларускага Падняпроўя / З.Я. Мажэйка, Т.Б. Варфаламеева. – Мінск: Беларус. навука, 1999. – 392 с.
13. Валачобныя песні / склад. Г.А. Барташэвіч, Л.М. Салавей, В.І. Ялатаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 560 с.
14. Вяселле. Песні: у 6 кн. / склад. Л.А. Малаш, З.Я. Мажэйка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980–1988. – Кн. 1–6.
15. *Аксамітаў, А.* Прыказкі і прымаўкі: тлумачальны слоўнік беларускіх прыказак і прымавак з архіваў, кафедр, збораў, рэд. выд. XIX і XX стст. / А. Аксамітаў. – Мінск: Беларус. навука, 2000. – 320 с.
16. Анталогія беларускай народнай прыказкі, прымаўкі і выслоўя / уклад. А.С. Фядосік. – Мінск: Ураджай, 2002. – 298 с.
17. *Варфаламеева, Т.Б.* Песні Беларускага Панямоння / Т.Б. Варфаламеева. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 287 с.
18. Песні пра каханне / склад. І.К. Цішчанкі, С.Г. Нісневіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 616 с.
19. Веснавыя песні / склад. Г.А. Барташэвіч, Л.М. Салавей, В.І. Ялатаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 607 с.
20. Казкі ў сучасных запісах / уклад. К.П. Кабашнікава, Г.А. Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 663 с.
21. Народная медыцына: рытуальна-магічная практыка / уклад. Т.В. Валодзіна. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 776 с.
22. Загадкі / склад. М.Я. Грынблат, А.І. Гурскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972. – 448 с.
23. Беларускі фальклор: хрэстаматыя / склад. К.П. Кабашнікаў і інш. – 4-е выд., перапрац. – Мінск: Вышэйш. шк., 1996. – 856 с.



SUMMARY

*The article investigates the semantics and symbolism of the image of the sea as apart of the cosmological code on the material Belarusian folklore genres. The author uses historical and genetic, functional and semantic methods and characterizes the image of the sea in connection with elements of other codes. Paper shows that the sea as apart of the cosmological code has a polar symbols and correlates with the elements of animal, vegetable, character, object, color, action and some other codes.*


Паступіў у рэдакцыю 16.01.2012 г.

Рэпазіторый БДУ

*УДК 821.111(73)Л. Эрдрыч*


***В.А. Радзіеўская,***
*аспірант кафедры замежнай літаратуры БДУ*


# АПАЗІЦЫЯ «СВАЁ – ЧУЖОЕ» Ў ТВОРЧАСЦІ ЛУІЗЫ ЭРДРЫЧ

Творчасць сучаснай амерыканскай пісьменніцы індзейскага паходжання Луізы Эрдрыч (Louise Erdrich, 1954) можна разглядаць як прыклад этнічнай літаратуры або літаратуры мультыкультуралізму – сацыяльна-культурнай з’явы ЗША, якая характарызуецца імкненнем да ўсведамлення культурнай, сацыяльнай і палітычнай роўнасці этнічных груп у межах дзяржавы. Мультыкультуралізм звязваюць з дыскурсам посткаланіяльных і посткультурных даследаванняў, адным з важных аспектаў якіх з’яўляецца пытанне ідэнтычнасці і яе прэзентацыі ў мастацтве і літаратуры тых культурных груп, што доўгі час былі пазбаўлены права на самавызначэнне і самарэпрэзентацыю. Першасная ўвага ў мультыкультуралізме як амерыканскім варыянце посткаланіяльных даследаванняў звяртаецца на пошук страчанай ідэнтычнасці, узаемадачыненні этнасаў і культур, усведамленне «іншага», падвойную або гібрыдную свядомасць, маргінальнасць і г. д. [1, с. 5]. З аднаго боку, прызнанне культурнай роўнасці этнічных груп садзейнічае захаванню і свабоднай сама-